# Пры распрацоўцы праграмы адраджэння чарнобыльскіх зямель першасная эканоміка – Даўгала

Ірына Даўгала. Фота з архіва
28 красавіка, Мінск /Кар. БЕЛТА/. Пры распрацоўцы праграмы адраджэння чарнобыльскіх зямель на першы план выходзіць эканоміка. Такое меркаванне член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў, дэпутат па Гомельскай-Савецкай акрузе нумар 34 Ірына Даўгала выказала газеце "СБ. Беларусь сегодня", каменціруючы даручэнне Прэзідэнта аб падрыхтоўцы адпаведнага дакумента, паведамляе БЕЛТА.

"Незалежна ні ад чаго, першасна – гэта эканоміка: будуць рабочыя месцы, будзе вытворчасць – значыць, будуць заработная плата і ўмовы для жыцця", – адзначыла парламентарый.

Паводле яе слоў, не менш важны аспект – экалогія і здароўе. "Людзі павінны ведаць, што яны жывуць няхай і не ў чыстай зоне, але бяспечнай. І гэта таксама ўплывае на стварэнне рабочых месцаў, – сказала Ірына Даўгала і падкрэсліла, што добрыя ўмовы ў забруджаных раёнах створаны ўжо цяпер. – Паглядзіце, наколькі чыстыя там вуліцы. У населеныя пункты ўкладвалася душа. Рэканструявалі не толькі самі раённыя цэнтры, але і аграгарадкі і нават маленькія вёскі. Стараліся рабіць так, каб жыць людзям было прыемна і камфортна".

Як паведамлялася раней, распрацаваць праграму адраджэння чарнобыльскіх зямель Аляксандр Лукашэнка даручыў 26 красавіка ў час нарады ў Брагіне.

"Гэта праграма павінна быць праграмай адраджэння зямель, мэтай якой павінна быць аднаўленне таго ўзроўню, як было да

Чарнобыля. З некаторымі асаблівасцямі”, – заявіў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, не варта імкнуцца аднавіць невялікія вёскі, і гэта не трэба рабіць: “Нам трэба вызначыцца, як мы гаварылі ў Нароўлі, дзе будуць жыць людзі. А гэта раённыя цэнтры (яны ёсць) і аграгарадкі, якія ў прынцыпе існуюць. Трэба сканцэнтравацца на гэтых аграгарадках”.

Адна з перспектыўных сфер для развіцця гэтых тэрыторый – лесанарыхтоўка і дрэваапрацоўка. “Але першачарговым чынам нам трэба высадзіць лес на свабодных плошчах, а іх нямала. Шмат такіх участкаў”, – адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Зразумела, будуць удзяляць увагу і сельскай гаспадарцы, якая займае значнае месца ў эканоміцы гэтых раёнаў.

“Поўдзень нашай краіны – мы павінны падумаць, што будзем рабіць. Аж да таго, што, як мы некалі планавалі, з Жыткавіч чыгунку кінуць да Ельска, закальцаваць. Цяпер палічым, калі яна хаця б за 10-12 гадоў акупіцца, гэта трэба рабіць, каб уключыць гэты рэгіён. Ну і іншыя дарогі трэба падцягваць. Словам, трэба аднаўляць раён, вызначыцца, дзе будуць жыць людзі. Мы павінны разумець, якія прадпрыемствы там пабудаваць, якія будуць рабочыя месцы”, – сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Стаіць задача выпрацаваць адпаведную праграму да верасня.

БЕЛТА